УДК 811.161.3'06'367-26

В. У. Русак, выкладчык

# НАЗОЎНЫ ТЭМЫ ЯК ЭКСПРЭСІЎНЫ СІНТАКСІЧНЫ СРОДАК У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЕ

This paper presents a study of structural peculiarities and functions of the constructions with the nominative case of theme in the contemporary Belarusian literary language. Meaning of the constructions with segmentation, the ways of expression of lexical correlates and stylistic potentialities of segmentation are described. The article demonstrates that the constructions with the nominative case of theme are used as means of paying attention of reader and of forming of subjective modality in the system of expressive syntax of the contemporary Belarusian language.

**Уводзіны.** Да актуальных праблем сучаснай лінгвістычнай навукі адносіцца даследаванне сродкаў экспрэсівізацыі маўлення, у тым ліку сінтаксічных сродкаў і прыёмаў, якія ўдзельнічаюць у перадачы эмоцый, ацэнак, надаюць паведамленню вобразнасць і выразнасць. Розныя аспекты гэтай праблемы сталі аб'ектам увагі вядомых вучоных беларускай і замежнай лінгвістыкі (Г. М. Акімавай, Ш. Балі, Э. М. Берагоўскай, В. У. Вінаградава, В. А. Маславай, Р. Я. Салганіка, А. П. Скавароднікава, Б. Тошавіча, А. І. Яфімава і інш.). Разам з тым многія пытанні застаюцца нявырашанымі: не дастаткова даследаваны спосабы і прыёмы стварэння экспрэсіўных сінтаксічных канструкцый, не раскрыты функцыі, якія могуць выконваць экспрэсіўныя сінтаксемы рознага тыпу ў тэксце. У сувязі з гэтым аналіз спосабаў выражэння і функцыянавання сродкаў экспрэсіўнага сінтаксісу ўяўляецца актуальным. Ён дае магчымасць раскрыць ролю і месца сінтаксічных сродкаў у сістэме сэнсава-эмацыянальнай арганізацыі тэксту, вылучыць і ўлічыць дадатковыя значэнні, якія могуць набываць сінтаксічныя адзінкі рознай структуры ў беларускай мове, назапашвае матэрыял пра стылістычныя рэсурсы мовы, дае каштоўныя звесткі для выяўлення спецыфікі нацыянальнай мовы на сінтаксічным узроўні.

**Асноўная частка.** У сучаснай беларускай літаратурнай мове ўсё большае пашырэнне набывае такая стылістычная фігура, здольная засяроджваць увагу адрасата на камунікатыўна значных элементах маўлення, як сегментацыя – «экспрэсіўна-эмацыянальнае вылучэнне, адчляненне ад асноўнай часткі сказа нарматыўнай сінтаксічнай канструкцыі, якая застаецца цесна звязанай са сказам па сэнсу» [1, с. 47]. Пры сегментацыі ў першую чаргу вылучаюць сінтаксічную адзінку, якая ў граматыцы вызначаецца як «назоўны тэмы» (ці «назоўны ўяўлення»). Назоўны тэмы – гэта назоўнік у назоўным склоне ці назоўнікавае словазлучэнне з галоўным кампанентам у пачатковай форме, што называюць «успомнены і намаляваны ва ўяўленні таго, хто гаворыць, прадмет, з'яву, факт, пра якія ў наступным сказе выказваецца пэўная думка, выражаецца пачуццё» [2, с. 122].

У канструкцыях з назоўным тэмы назоўнік вылучае на першы план прадмет, з'яву ці асобу чалавека, пра якія выказваецца пэўнае меркаванне. Самастойнасць назоўнага тэмы вельмі абмежаваная. Як адзначаецца ў лінгвістычный літаратуры, «інтанацыйна і сэнсава ён так цесна звязаны з папярэднім ці наступным выказваннем, што ўтварае разам з імі фразу, сэнс якой зразумелы толькі тады, калі яе прачытаць цалкам» [3, с. 32]. У сказе, які ідзе за назоўным тэмы, часцей за ўсё ёсць другаснае абазначэнне ўжо названага паняцця, т. зв. лексічны карэлят.

Найчасцей лексічны карэлят выражаецца асабовым займеннікам: *Мова.* ***Яна*** *сама, развіваючыся, пераступае праз тое, што не прыжылося ў ёй і што асталося толькі як адзнака нейкага гістарычнага перыяду, нейкага ўнутранага працэсу*; *Талент і праца.* ***Яны*** *з'яднаныя непарыўна, іх нельга растлумачыць, толькі разам яны могуць даць сапраўдны плён, бо адно без аднаго – бездапаможныя; Музыка крокаў.* ***З ёю*** *я клаўся спаць і ўставаў.* ***Пад яе*** *чытаў і пісаў замалёўкі ў газеты* (Я. Сіпакоў); *Дарогі! Колькі* ***іх*** *агульных для ўсіх людзей і асабістых у жыцці кожнага чалавека* (А. Пальчэўскі); *А дзеці...Колькі радасці, светлых незабыўных хвілін прыйшло разам* ***з імі*** *ў хату...* (Б. Сачанка).

Карэлят можа выражацца назоўнікам (у спалучэнні з указальным займеннікам ці з указальнай часціцай): *Род... Народ...* ***Гэтыя словы*** *вельмі многа азначаюць для краіны ўцэлым і для кожнага як грамадзяніна асобна* («Звязда» 01.01.98); *Цэп, сявенька, серп...Тыя, што аж вар'яцеюць ад радасці і замілавання, калі чуюць жахлівы піск свіней, якіх рэжуць на сала, папракалі мяне за пакланенне* ***гэтым*** *адвечным сялянскім* ***памочнікам і ўлюбёнцам****; Свая, родная мова.* ***Гэта мова*** *маіх маці і бацькі, якую я разумею ад першага пачутага мною слова,* ***гэта мова*** *маіх бабулі і дзядулі, якіх я ведаю,* ***гэта мова*** *маіх прадзедаў і прапрадзедаў, якіх я не ведаю, але заўсёды адчуваю за сабою; І. Сібарсач. Калі і як узнік у «Вожыку»* ***гэты псеўданім****, не памятаю* (Я. Сіпакоў).

У творах мастацкай літаратуры і ў публіцыстыцы канструкцыі з назоўным тэмы ўжываюцца перш за ўсё як сродак актуалізацыі

чытацкай увагі. Дзякуючы т. зв. *двайному абазначэнню тэмы* гэтыя экспрэсіўныя сродкі дазваляюць засяроджваць увагу рэцыпіента на тэме паведамлення, бо, як слушна заўважаў А. М. Пяшкоўскі, у сегментаваных канструкцыях думка падаецца па частках: «напачатку выстаўляецца напаказ ізаляваны прадмет, і слухачам вядома толькі тое, што пра гэты прадмет зараз будзе нешта сказана і што пакуль за гэтым прадметам трэба назіраць; у наступны момант выказваецца сама думка» [4, с. 405]. Звернемся да некаторых прыкладаў: ***Агрэсіўнасць.*** *Выходзіць, яна можа існаваць не толькі сама па сабе, а яшчэ як адна з магчымасцей атрымаць радасць, мець асалоду, быць шчаслівым, як адна з праяў геданізму*; ***Аазіс.*** *Якім толькі маё развярэджанае ўяўленне не малявала яго – казачным, нечаканым, міражным, але ніколі, ніводнага разу вось такім – будзёным і звычайным* (Я. Сіпакоў). У прыведзеных прыкладах выдзеленыя пры дапамозе сегментацыі адрэзкі маўлення інтанацыйна адасобленыя ад наступных частак. Яны набываюць пэўную структурную самастойнасць і разам з гэтым вылучаюць тыя аб’екты паведамлення, якія ўяўляюцца пісьменніку найбольш значнымі. Праз сегментацыю аўтар актывізуе асацыяцыі чытача, яго алюзіі ці ўспаміны, апелюе да нагляднa-вобразнага ўспрыняцця. Экспрэсія выказванняў ствараецца ў выніку двайнога абазначэння тэмы: у сказах, якія ідуць пасля назоўных уяўлення, ёсць займеннікі *яна, ён,* якія адсылаюць чытача да раней ужытых слоў *агрэсіўнасць, аазіс*. Пры трансфармацыі прыведзеных выказванняў у стылістычна нейтральныя, цэласныя канструкцыі іх аб’ектыўнае значэнне застаецца нязменным, аднак экспрэсіўнасць, якую надаюць канструкцыям сегменты, губляецца. Параўн.: *Выходзіць, агрэсіўнасць можа існаваць не толькі сама па сабе...; Якім толькі маё развярэджанае ўяўленне не малявала аазіс...*

Дзякуючы своеасаблівай структуры, канструкцыі з назоўным тэмы могуць перадаваць суб’ектыўнае стаўленне аўтара да інфармацыі. Назоўны тэмы дае аўтару магчымасць у лаканічнай форме адначасова паведаміць нешта пра пэўны прадмет, з’яву і выявіць уласную пазіцыю ў адносінах да яго, бо, як вядома, выдзяленне ўжо само па сабе ёсць ацэнка: ***Спадчына.*** *Якое простае слова, і які няпросты яго сэнс* (В. Вітка); ***Сляды на пяску***. *Якія гэта дзівосныя ўзоры! І як прыемна іх разглядаць, чытаць!*; ***Балбатуны.*** *Як красуюцца яны ўсюды: і за трыбунамі, і ў застоллях, і проста там, дзе сабралася больш двух чалавек* (Я. Сіпакоў). Шляхам вынясення ў прэпазіцыю назоўнікаў *спадчына*, *балбатуны* і словазлучэння *сляды на пяску* аўтары не толькі вылучаюць тэму выказванняў, але і падкрэсліваюць уласную ацэнку.

У пазіцыі назоўнага тэмы можа ўжывацца інфінітыў ці інфінітыўнае словазлучэнне. Гэта пацвярджае думку, выказаную С. І. Карцэўскім, што «амаль да ўсіх функцый назоўніка ёсць аналагічны зварот з інфінітывам…» [5, с. 294]. Функцыянальная тоеснасць такіх утварэнняў назоўнаму тэмы не выклікае сумненняў: ***Умець пісаць.*** *Нярэдка вельмі многа надзей і спадзяванняў ускладаем мы на гэты – амаль апошні, амаль заключны перыяд складанай, псіхалагічна-непаўторнай пісьменніцкай творчасці*; ***Умець слухаць чалавека…*** *Які гэта патрэбны, неабходны пісьменніку талент!*; ***Навучыць нашчадка чытаць, пісаць, гаварыць…*** *Які гэта высакародны абавязак!* (Я. Сіпакоў). Вынясенне інфінітыўных словазлучэнняў у прэпазіцыю, як і ў канструкцыях з назоўным уяўлення, вылучае тэму асноўнага сказа, акцэнтуючы на ёй увагу чытача.

У сучаснай беларускай літаратурнай мове выразна вылучаюцца два тыпы назоўнага тэмы: прадметны і слоўны. Пры дапамозе першага аўтары прыцягваюць увагу чытача да таго, *ш т о* абазначана словам:

– да з’яў, прадметаў, паняццяў: ***Крыжжыцця.*** *Колькіх зламаў ён, але колькім і памог выжыць;* ***Мары. Славуты старажытны Мерв.*** *Памятаю, як яшчэ ў Мінску мне хацелася пабываць тут, каб сваімі вачамі зірнуць на «слаўнейшы з гарадоў Харасана»;* ***Мутацыя…*** *Яна спараджае гігантызм у дрэў і жывёл* (Я. Сіпакоў); ***Палессе…*** *Велізарны, поўны таямніц край у самым цэнтры Еўропы* (Ю. Лабынцаў);

– да асобы чалавека: ***Уладзімір Караткевіч***. *Выдатны апавядальнік. І душа, здаецца, любой кампаніі. Слухаючы яго ўспаміны пра неверагодныя сустрэчы і здарэнні, думалася, што ён толькі тое і робіць, што трапляе ў нестандартныя, як кажуць зараз, сітуацыі…;* ***Аляксандр Кузьміч Бабарэка.*** *Пляменнік Адама Бабарэкі. Выдатнейшы рускі літаратуразнаўца, даследчык спадчыны Івана Аляксеевіча Буніна, які, здаецца, ведаў пра яго ўсё. Мне пашчасціла пазнаёміцца з гэтым цікавейшым чалавекам у Кактэбелі, у Доме творчасці пісьменнікаў, дзе нашы пакоі былі побач;* ***Янка Купала.*** *Народны пясняр. Прарок. Мудрэц. Волат. Ваяр, змаганец за Беларусь. Славуты настаўнік і паслухмяны, цярплівы вучань – ён вучыў свой родны беларускі народ і апантана вучыўся ў яго сам* (Я. Сіпакоў); ***Колас… Купала…*** *У гуках імён іх люлянку я чую, Якую матуля калісь над калыскай маёю спявала – Колас. Купала…* (У. Някляеў).

Другі тып назоўнага тэмы дазваляе засяродзіць чытацкую ўвагу на самім слове, а іменна, *н а   я г о   г у ч а н н і ,   н а п і с а н н і ,* лексічным значэнні: «***Хушамадзед***»… *Мне чуецца гэтае запрашэнне як адно слова*; ***Абарона***

***і забарона***. *Усёй розніцы між імі – адна літара. Але затое якая яна магутная і бязлітасная, гэтая літара!*; «***Урачыха***». *Так мы пішам. Жахліва. Што яна хоча ўрачы? А чаму не* «*лекарка*», «*доктарка*»*? Мусіць, таму, што ў слоўніку* «*урачыха*» *стаіць першае*; «***Матуля***»***…*** *Як перакласці на русскую мову гэта цудоўнае слова?* «*Маменька?*» *Не.* «*Матушка?*» *Не тое.* «*Мамаша?*» *Што вы!;* ***Селянін. Калгаснік.*** *Неяк так здарылася, што гэтыя звычайныя і нармальныя словы зрабіліся быццам бы абразлівымі…* (Я. Сіпакоў). Такія канструкцыі выяўляюць схільнасць аўтараў да каменціравання важных, на іх думку, слоў, выразаў.

Назоўны тэмы звычайна аддзяляецца ад наступнага сказа кропкай: ***Імітацыя.*** *Яна ўсюды брыдкая, але асабліва непрыстойная на эстрадзе;* ***Народная творчасць***. *У ёй усё – філасофія і геаграфія, раман і аповесць, характары людзей і багацце сюжэтных ліній, едкая сатыра і самая смелая фантастыка…* (Я. Сіпакоў).

Аднак калі аўтару неабходна стварыць уражанне ўзрушанасці, перадаць свой роздум, звярнуць увагу на неабходнасць далейшага тлумачэння, удакладнення, ён ужывае шматкроп'е: ***Маладыя паэты…*** *Успомнім, як абураўся А. Твардоўскі, калі ў рэцэнзіі на* «*Краіну Муравію*» *Адаліс назвала яго маладым паэтам:* «*... мне не падабаецца калі гавораць* “*малады паэт*” »; ***Нітраты, нітрыты…*** *Адно шкоднае, а другое – еш колькі хочаш… А мне здаецца, што гэтая розніца знарок прыдумана, каб яшчэ больш заблытаць разгубленага чалавека, які і так ужо не ведае, чым харчавацца…;* ***Вольныя, шырокія верлібры Максіма Танка…*** *Ці не з'яўляюцца яны своеасаблівай рэакцыяй на вельмі ж ужо масавае ўмельства гладзенька* «*састаўляць*» *строфы вершаў?* (Я. Сіпакоў).

У беларускай літаратурнай мове таксама распаўсюджаны назоўны тэмы з пытальнай інтанацыяй: ***А вочы?*** *Яна цяпер хацела прыпомніць, што яны гаварылі заўсёды, калі, нібы незнарок, спыняліся на ёй* (І. Пташнікаў); ***Ну, а масла?*** *Што пра масла скажаш? І не трэба, а не абмінеш. Калі гэткім маслам рыфмы змажаш, нават верш няўдалы праглынеш* (П. Панчанка).

Назоўны тэмы можа быць пазначаны клічнай інтанацыяй. У такім выпадку пісьменнік падкрэслівае эмацыянальны характар паведамлення, дае аўтарскую ацэнку інфармацыі: ***Справядлівасць!*** *Дзе і калі яна была беднаму, цёмнаму чалавеку!* (І. Мележ); ***А прырода!*** *Колькі вялікага задавальнення дае нам яна!* (Я. Колас); ***Надзеі! Мары!*** *Колькі часу аддае ім чалавек у сваім жыцці* (П. Галавач).

Назоўны тэмы можа вылучацца ў самастойны абзац:

***Кольскі паўвостраў…***

*Яшчэ са школьнай пары… ён мне здаваўся, уяўляўся, мроіўся шыкоўным хвастом мажнога паўночнага мядзведзя;*

***Крокі… Крокі… Крокі…***

*Раніцою, у яшчэ не растрывожанай цішыні, яны гучалі асабліва выразна* (Я. Сіпакоў).

Абзацаванне ў спалучэнні з недагаворанасцю (графічна абазначана шматкроп'ем) робіць паўзу паміж назоўным тэмы і наступным сказам больш працяглай, надаючы сегментаванай канструкцыі асаблівую выразнасць.

**Заключэнне.** Такім чынам, у сістэме экспрэсіўных сінтаксічных сродкаў, характэрных для сучаснай беларускай літаратурнай мовы, адметнае месца займае сегментацыя. Праз выкарыстанне такіх сегментаваных канструкцый, як назоўны тэмы і інфінітыў тэмы, пісьменнікі актывізуюць чытацкую ўвагу і асацыяцыі, выяўляюць уласную пазіцыю, выклікаючы адпаведную рэакцыю чытача.

## Літаратура

1. Шандроха, Н. Э. Экспрэсіўны сінтаксіс: вучэб.-метад. дапам. / Н. Э. Шандроха. – Гродна: Гродзен. дзярж. ун-т, 2002. – 61 с.
2. Яўневіч, М. С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы: вучэб. дапам. / М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. – 3-е выд., дапрац. – Мінск: Выш. шк., 1987. – 272 с.
3. Гаўрош, Н. В. Намінатыўныя сказы ў сучаснай беларускай мове / Н. В. Гаўрош. – Мінск: Выш. шк., 1975. – 96 с.
4. Пешковский, А. М. Русский синтаксис в научном освещении / А. М. Пешковский. – 7-е изд. – М.: Учпедгиз, 1956. – 511 с.
5. Карцевский, С. И. Еще к вопросу об учебниках А. М. Пешковского / С. И. Карцевский // Из лингвистического наследия / С. И. Карцевский. – М., 2000. – С. 281–305.